# БССР - 100 ГОД. ПЕРШЫЯ КРОКІ АДУКАЦЫІ.

Куракевіч Н. І., кандыдат гістарычных навук, дацэнт, БДУІР, г. Мінск

У выніку ўтварэння ССРБ у студзені 1919 г. быў створаны Народны Камісарыят Асветы ССРБ. Перад ім стаяла задача перабудовы ўсей школьнай сістэмы: "правядзення бясплатнай і абавязковай адукацыі ўсіх дзяцей, арганізацыя дашкольнага выхавання, здзяйсненне прынцыпаў працоўнай школы, свабоднай ад рэлігійнага ўплыву, ліквідацыя непісьменнасці, шырокае развіцце прафесійнай і рабочай адукацыі, забеспячэнне шырокага доступу рабочых і сялян у аудыторыі вышэйшай школы" [1, арк. 38].

4 студзеня 1919 г. быў падпісаны дэкрэт аб стварэнні Савета абароны дзяцей, у абавязкі якога ўваходзіла барацьба з дзіцячай беспрытульнасцю, арганізацыя дзіцячых садоў і калоній, іх фінансаванне, эвакуацыя і размяшчэнне дзяцей з галадаючых губерняў.

У Мінску ствараюцца 3 дзіцячыя дамы, у Бабруйску 3 дзіцячыя сады і 3 дзіцячыя дамы. У іншых гарадах і мястэчках на базе былых памешчыцкіх маёнткаў наладжваюцца дамы, калоніі і камуны. Былі ў гэты час створаны і камісіі па справах непаўналетніх, якія ўстанаўлівалі новыя прынцыпы барацьбы з дзіцячай злачыннасцю. Суды і турмы для непаўналетніх ліквідаваліся.

Прыкметны след у гісторыі савецкай асветы пакінулі Літвінавіцкая і Леменская школы-камуны, ініцыятарам стварэння якіх быў Панцеляймон Мікалаевіч Лепяшынскі. П.М. Лепяшынскі - выдатны педагог, у савецкі перыяд многія свае працы прысвяціў сацыялістычным пераўтварэнням у галіне народнай асветы, новаму зместу навучання ў школе, прынцыпам і метадам навучання і камуністычнага выхавання, народнаму настаўніку і яго ролі ў ажыццяўленні культурнай рэвалюцыі ў нашай краіне. Ён быў арганізатарам першых доследна-паказальных працоўных школ-камун у Беларусі. У 1919 г. Мінскім аддзелам народнай адукацыі ў маёнтку Весялоўка, была створана вучнёўская сельскагаспадарчая камуна. У камуну ўвайшлі 40 навучэнцаў школы II ступені, настаўнікі і спецыялісты па сельскай гаспадарцы. У камуне было 64 дзесяціны зямлі, занятыя пад лес і луг, для агарода 15 дзесяцін [2, с. 15]. Школы-камуны прапагандавалі калектывісцкія прынцыпы ў навучальна-выхаваўчай рабоце.

У лютым 1919 г. Літва і Беларусь аб'ядналіся ў адзіную Літоўска-Беларускую ССР. За час існавання ЛітБела пытаннямі народнай адукацыі ў Беларусі займаліся Наркамасветы ЛітБела і аддзел народнай адукацыі Літгубрэўкама. Важнейшым дакументам па пытаннях асветы з'явіўся дэкрэт Савета Народных Камісараў Літвы і Беларусі "Аб рэарганізацыі школьнай справы". Гэтым дэкрэтам уводзілася адзіная працоўная школа творчай працы, дапасаваная да мясцовых умоў народнага жыцця. Неад'емнымі ўмовамі пры правядзенні гэтай работы былі: агульнадаступнасць, агульнаабавязковасць і свецкасць школ.

Навучанне ў школах абедзьвюх ступеняў у Беларусі з'яўлялася бясплатным, супольным для хлопчыкаў і дзяўчынак, наведванне школы было абавязковым для ўсіх дзяцей школьнага ўзросту. Вызначалася нарматыўная колькасць вучняў на аднаго настаўніка - 25 чалавек [3, с. 17-18]. Усе школьныя работнікі павінны былі штогод перавыбірацца, згодна з дэкрэтам аб выбарнасці педагагічных пасад. Кожны настаўнік меў адзін свабодны дзень ў тыдзень і два свабодныя месяцы на працягу года. Пры Наркамасветы Літоўска-Беларускай ССР у Вільні і губернскім аддзеле народнай адукацыі ў Мінску былі створаны нацыянальныя секцыі (беларуская, літоўская, руская, польская, яўрэйская). Было арганізавана выданне літаратуры і падручнікаў на беларускай і іншых мовах, выпускаўся часопіс "Школа і культура Савецкай Беларусі". Беларускай секцыяй Мінскага губернскага аддзела народнай адукацыі быў распрацаваны план стварэння школ з выкладаннем на роднай мове. Шэраг школ Мінска, дзе ў якасці педагогаў працавалі былыя слухачы першых беларускіх настаўніцкіх курсаў, пачалі выкладанне на роднай мове. Крыху пазней у Мінску была створана і беларуская гімназія.

Акупацыя польскімі войскамі часткі тэрыторыі Беларусі вясной 1919 г. прыпыніла працу па рэарганізацыі школьнай справы і нанесла ёй вялікі ўрон. Польскія ўлады прыняліся за арганізацыю вузкай, нацыяналістычнай польскай сярэдняй і ніжэйшай школы. І ўжо ў студзені 1920 г. большая частка сярэдніх школ была "упанствавана". Польскія пачатковыя школы былі выдзелены з іншых пачатковых школ і перададзены ў падначаленне Польскай школьнай радзе, якая мела досыць сродкаў. Беларускія і рускія настаўнікі знаходзіліся ў крытычным стане да канца навучальнага года, а з 1-га мая яны былі аб'яўлены звольненымі. Настаўнікі яўрэскіх школ маглі існаваць лепш, дзякуючы яўрэйскай абшчыне. Газета "Звезда", якая выходзіла ў Смаленску, пісала аб польскай акупацыі: "Усе школы і вучылішчы закрыты. Пачалі функцыяніраваць толькі польскія. Але было аб'яўлена, што школы на іншых мовах могуць быць адкрыты на прыватныя сродкі, з дазволу ўлад. Усе няпольскія цэнтры закрыты, і дзеці беднаты літаральна апынуліся выкінутымі на вуліцу"[4].

Начальнік Мінскай акругі Рачкоўскі заявіў, што дзяржаўнай мовай на Беларусі з'яўляецца польская мова, а мясцовай мовай большасці насельніцтва - беларуская. Усё справаводства ў дзяржаўных установах будзе весціся на польскай мове. Школы з выкладаннем на мясцовых мовах могуць мець падтрымку з боку органаў мясцовага самакіравання горада і земства [5].

Летам 1920 г. акупанты абазначылі ўвесь свой шлях паспешнага адступлення пажарышчамі і руінамі школьных будынкаў і культурна-асветніцкіх устаноў. У адной толькі Мінскай губерні было знішчана 50% школьных будынкаў. У школах Рэчыцы і паветах на 75% былі знішчаны бібліятэкі, кабінеты, школьныя прылады. Толькі ў Барысаўскім павеце было разбурана і спалена 18 школьных будынкаў [6, арк.98].

У жніўні 1920 г. тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад палякаў. Быў створаны аддзел народнай адукацыі, які ў жніўні 1920 г. перайменавалі ў Камісарыят асветы ССРБ, а ў снежні 1920 г. быў створаны Наркамасветы ССРБ.

Нягледзячы на тое, што нямецкія і польскія акупанты пад выглядам барацьбы з бальшавізмам разбуралі і выкаранялі народную школу, а буржуазія ўсіх нацый неахайна імкнулася знішчыць усе сляды кароткачасовай савецкай работы ў галіне асветы, усе ж такі былі дасягнуты пэўныя поспехі ў рэфарміраванні адукацыі і школьным будаўніцтве. І калі перад Савецкай Беларуссю з’явіліся перспектывы мірнага будаўніцтва, абавязкам органаў народнай адукацыі было развіць максімум энергіі, каб знішчыць сляды буржуазнага дыктату ў справе народнай адукацыі, аднавіць работу першага перыяду Савецкай улады ў Беларусі і прыступіць да шырокай творчасці ў галіне народнай асветы.

Для паспяховага выканання вялікіх задач у галіне школьнага будаўніцтва было неабходна падрыхтаваць новы кантынгент педагагічнага персаналу, нягледзячы на іншыя праблемы. Настаўнік - цэнтральная фігура ў школе, ад яго залежала вучэбна-выхаваўчая работа, ідэйна-палітычны і навуковы ўзровень адукацыі. Савецкі настаўнік павінен быў не толькі вучыць дзяцей грамаце, але і фарміраваць іх характар, выхоўваць чалавека сацыялістычнага грамадства. Роля настаўніка, асабліва сельскага, не абмяжоўвалася толькі вучэбна-выхаваўчай работай унутры школы. Настаўнік з’яўляўся адначасова і праваднікам пралетарскай культуры, камуністычных ідэй у асяроддзе шырокіх працоўных мас. Сельскі настаўнік звязваў сялянскія масы з рабочым класам. Але рабіць гэта было вельмі нялёгка.

Ужо ў першыя месяцы Савецкай улады сярод настаўніцтва вызначыліся тры асноўныя палітычныя накірункі. Першы накірунак быў прадстаўлены прывілеяванай і матэрыяльна забяспечанай да рэвалюцыі групай настаўнікаў гімназій і іншых навучальных устаноў. Гэта частка настаўнікаў выступала супраць Савецкай улады, уцягваючы адначасова ў кола сваёй палітыкі асноўныя масы настаўнікаў. Пранікнутыя духам буржуазнай ідэалогіі, яны прапаведвалі тэорыю незалежнасці школы ад палітыкі, выступалі супраць стварэння адзінай працоўнай школы, імкнуліся аднавіць папярэднія метады навучання і выхавання дзяцей, адмаўляліся працаваць у савецкай школе.

Другі накірунак быў прадстаўлены настаўнікамі гарадскіх і сельскіх школ. Гэта частка настаўнікаў, якая выйшла з духавенства, кулацтва, дробных чыноўнікаў, спачатку пахіснулася ў бок ворагаў пралетарскай дыктатуры, а пазней, калі надзея на ліквідацыю Савецкай улады знікла, стала супрацоўнічаць з органамі народнай адукацыі.

Трэці накірунак быў прадстаўлены вялікай колькасцю сельскіх настаўнікаў, выхадцаў з асяроддзя рабочых і сялян, якія былі звязаны паміж сабой братэрскай сувяззю. Гэта частка настаўнікаў са спачуваннем сустрэла

Кастрычніцкую рэвалюцыю і адразу ж уключылася ў будаўніцтва савецкай школы.

Урад рэспублікі і Камуністычная партыя Беларусі вялі рашучую барацьбу з варожымі выпадамі старога настаўніцтва, выкрывалі яго лжывую прапаганду і агітацыю, выключалі найбольш нязгодных са школы. У той жа час кіраўніцтва рэспублікі патрабавала ад мясцовых органаў улады ўважлівых адносін да запатрабаванняў настаўнікаў, асабліва сельскіх. У выніку сабатаж старога, буржуазнага настаўніцтва быў зломлены, асноўная частка перайшла на пазіцыі ўрада і актыўна ўлілася ў будаўніцтва новай школы.

Дзяржаўнымі органамі сярод настаўніцтва праводзілася ідэалагічная і арганізацыйная работа. Гэта - стварэнне шырокай масавай настаўніцкай арганізацыі - Саюза работнікаў асветы і сацыялістычнай культуры - клопат аб паляпшэнні становішча народных настаўнікаў, правядзенне выбараў педагагічнага персаналу, разгортванне работы па ліквідацыі палітычнай непісьменнасці і азнаямленні настаўнікаў з прынцыпамі адзінай працоўнай школы. Гэтыя і іншыя мерапрыемствы з’яўляліся першымі крокамі збліжэння асноўнай масы настаўніцтва Беларусі з Савецкай уладай і супрацоўніцтва з ёю. Значнасць гэтых крокаў вызначалася не маштабамі, а хутчэй тэндэнцыяй, накірункам развіцця. Наперадзе была вялікая ідэалагічная і арганізацыйная дзейнасць па ўцягненні настаўніцтва ў актыўнае сацыялістычнае будаўніцтаа.

Такім чынам, савецкі ўрад здзяйсняў актыўны пошук форм прафесійнай арганізацыі настаўніцтва. Сярод яго праводзілася ідэалагічная і арганізацыйная работа, быў створаны Саюз работнікаў асветы і сацыялістычнай культуры. Дзяржава праяўляла клопат аб паляпшэнні матэрыяльнага становішча народных настаўнікаў, ліквідацыі іх палітычнай непісьменнасці, азнаямленні з прынцыпамі адзінай працоўнай школы. Арганізоўваліся таксама перавыбары педагагічнага персаналу. Дзяржаўная палітыка ў галіне адукацыі насіла класавы характар. Яна праводзілася ў інтарэсах народа і для народа і была накіравана на ліквідацыю ідэйнай раз’яднанасці паміж асобнымі групамі працаўнікоў асветы, прыцягванне да педагагічнай дзейнасці выхадцаў з рабочых і сялян, павышэнне ролі настаўніцтва ў будаўніцтве новага сацыялістычнага грамадства.

Літаратура:


1. НАРБ , ф.101, воп. 1, ст. 3603.
2.“Школяры-коммунары” // Школа и революция.-1919.-№22-23 (№2. 07.07.1919). - С. 15.
3. Декрет о реорганизации школьного дела // Школа и культура Советской Белоруссии.-1919.-№1.-С. 16-18.
4. В польской оккупации (Минской губ.) // Звезда,-1919,-26 октября,-С.5-6.
5. Полонизация Белоруссии // Звезда.-1919,-19 октября,-С.9.
6. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.603.